# "Калісь глядзеў на сонца я..."

## Галерэя партрэтных вобразаў да 135-годдзя Максіма Багдановіча



***Уладзімір Сулкоўскі*. Партрэт М. А. Багдановіча.**
1985 г. Палатно, алей.
*Літаратурны музей Максіма Багдановіча.*

РЭЧЫ І ГІСТОРЫІ

ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

# "КУХНЯ ПІСЬМЕННІКА"

## РЭЧЫ СЯМ'І БАГДАНОВІЧАЎ



**Блюда, каўнік і скрынка для гарбаты з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтваў.**

Аднойчы ў каментарыях да фотаздымкаў музейнай экспазіцыі нехта напісаў: "Няўжо вы думаеце, што дух паэта захоўваецца ў нейкім там гарнітуры альбо побытавай рэчы?" І сапраўды, галоўнае, што пакінулі нам пісьменнікі, – гэта іх творы. Яны самадастатковыя ў сваёй каштоўнасці і не патрабуюць матэрыяльнага падмацавання. Але што паробіш, калі чалавек любіць гісторыі і яму падабаецца прывязваць іх да нейкіх рэчыўных доказаў.

Разглядаеш выяву з выдання "Скарбніца" Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтваў, на якой мельхіёравае блюда, кавярнік і скрынка для гарбаты, перададзеныя ва ўстанову нашчадкамі Багдановічаў, – і адразу ў галаве разгортваецца нізка асацыяцый.

Каўнік выдатна ілюструе прагрэсіўны вобраз маці Максіма Марыі Апанасаўны Мякоты. Побач з сучаснымі для таго перыяду педагагічнымі тэхналогіямі Фрэбеля і Мантэсоры яна мела і модныя (часам шкодныя) звычкі. Самавар з абаранкамі і кава з папяросай – рэчы ўсё ж рознага семантычнага поля.

Тое самае і з бляшанкай ад гарбаты, якая дапамагае раскрыць адну з гісторый мінскага перыяду жыцця Максіма Багдановіча: яго адмову ад салодкага, пустую гарбату – і назапашаны цукар для дзіцячага прытулку.

У дадатак – блюда, і вось мы ўжо на кухні, і гісторыі пачынаюць паўставаць літаральна самі па сабе. Прыгадваецца дзед Максіма, прыгонны кухар, і праца Адама Багдановіча кандытарам у цукерні, якую ён падрабязна апісаў у кнізе "Я всю жизнь стремился к свету".

Цяжка ўявіць знакамітага фалькларыста і вучонага за выпяканнем булак альбо вырабам марозіва і салодкай памадкі. А яму, між іншым, самаробныя цукеркі дапамагалі фліртаваць са знаёмымі дзяўчатамі: "Я баловал своих сверстниц произведениями своего искусства. Кажется, это лучшее употребление, которое я сделал из своей кондитерской выучки".

Здольнасцямі да кулінарыі вылучаўся не толькі бацька паэта. Максім Горкі так упадабаў бліны цёткі Максіма Марыі, што стаў сватам на яе вяселлі, а пра хатнія беларускія каўбасы, што яна выраблялa, хадзіла вялікая пагалоска.

У сям'і Багдановічаў добрае ўменне гатаваць было справай звычайнай, і аднастайны стол новых ніжагародскіх знаёмых выклікаў у іх вялікае непаразуменне.

Мы не можам адказаць дакладна, ці карыстаўся Максім Багдановіч паказанымі на фотаздымку рэчамі, ці яны з'явіліся ва ўжытку пазней. Увогуле, мы амаль нічога не ведаем пра яго гастранамічныя захапленні.

Пасля трэцяга бацькавага шлюбу ён не любіў сталавацца дома і ўсё часцей наведваў студэнцкую сталовую, пра якую надрукаваў фельетоністтую нататку з развагамі пра "сталоўскія" парадкі ("вареники, несмотря на дороговизну кожи, как будто сделаны из последней"; апісанне "правільнага" спосабу ўжывання супу).

Так, побытавыя рэчы – проста рэчы, але хто будзе спрачацца, што з імі кожная гісторыя гучыць смачней. Падаецца, такі эпітэт у нашай нататцы будзе да месца.

**Міхась БАРАНОЎСКІ,**
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.